# ВЫШЭЙШАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСІ: СТАН І ШЛЯХІ ТРАНСФАРМАЦЫІ

**М. А. Яцэвіч,** *дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

Вышэйшай бібліятэчнай адукацыі Беларусі ў кастрычніку 2014 года споўнілася 70 гадоў: як відаць, яна мае сваю прадгісторыю. Вышэйшая бібліятэчная адукацыя бярэ свой пачатак з далёкіх 20-х гадоў мінулага стагоддзя, калі пры Галоўпалітасвеце ў кастрычніку 1920 года адкрыліся курсы па падрыхтоўцы бібліятэкараў Беларусі. Праграма іх была разлічана на 6 месяцаў: на працягу першых трох ажыццяўлялася агульнаадукацыйная падрыхтоўка, а ў наступныя месяцы курсанты вывучалі спецыяльныя дысцыпліны.

Першай навучальнай установай рэспублікі па падрыхтоўцы супрацоўнікаў бібліятэк стала Магілёўская савецкая партшкола, якая па рашэнні аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б з 1926 года стала рыхтаваць загадчыкаў хат-чытален, і ўжо ў 1926 годзе было выпушчана 90 супрацоўнікаў для адпаведных мэт. У 1928 годзе Магілёўская саўпартшкола была рэарганізавана ў пазашкольны тэхнікум з чатырохгадовым тэрмінам навучання, дзе пачалі рыхтаваць бібліятэкараў, загадчыкаў хат-чытален, загадчыкаў народнымі дамамі, а таксама выкладчыкаў грамадазнаўства, настаўнікаў пунктаў лікбеза і школ для малапісьменных. З мэтай удасканалення падрыхтоўкі супрацоўнікаў бібліятэк у 1930 годзе ў тэхнікуме было адкрыта бібліятэчнае аддзяленне з наборам 60 чалавек навучэнцаў.

У гэтым жа годзе на палітасветаддзяленні педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта была зроблена першая спроба падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй для бібліятэк рэспублікі. Пасля рэарганізацыі факультэта ў 1931 годзе на яго аснове была створана самастойная навучальная ўстанова – педагагічны інстытут, а палітасветадзяленнеператварылася ва Усебеларускі палітасветінстытут, які распачаў сваю работу ў Магілёве. У інстытуце былі тры аддзяленні: арганізацыйна-інструктарскае, бібліятэчнае, масавай палітычна-асветніцкай работы. Пасля рэарганізацыі інстытута ў 1936 годзе ў Вышэйшую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

партыйна-асветніцкую школу бібліятэчнае аддзяленне захавалася і працягвала падрыхтоўку спецыялістаў да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

І вось наступіў 1944 год… Яшчэ не скончылася Вялікая Айчынная вайна. Беларусь разбурана, знявечана, разрабавана, але менавіта ў гэты час тагачасны ўрад пачаў клапаціцца пра бібліятэчныя калекцыі, пра аднаўленне бібліятэк, пра бібліятэчную адукацыю. Праз 18 дзён пасля вызвалення Мінска ў Пастанове Савета Народных камісараў БССР «О восстановлении книжного фонда Государственной библиотеки БССР им. В.И.Ленина, областных, городских и районных библиотек» ад 21 ліпеня 1944 года быў змешчаны спецыяльны пункт, прысвечаны арганізацыі вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў рэспубліцы: «…просить Комитет по делам высшей школы при СНК СССР разрешить создать при Минском педагогическом институте библиотечный факультет». Дазвол быў атрыманы і Пастановай СНК БССР ад 29 ліпеня 1944 года ў Мінскім педагагічным інстытуце быў створаны бібліятэчны факультэт. 1 кастрычніка 1944 года з першымі студэнтамі на факультэце пачаліся заняткі. Была створана кафедра бібліятэказнаўства, загадчыкам якой стаў выбітны дзеяч беларускай культуры, бібліёграф, перакладчык, педагог, дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна Іосіф Беніцыянавіч Сіманоўскі, які ў 1942−1944 гг. выкладаў у Маскоўскім бібліятэчным інстытуце.

На І курсе ў 1944–1945 вучэбным годзе на кафедры навучалася 22 студэнты, прычым розныя па ўзросце, сярод іх – удзельнікі вайны і партызанскага руху; у 1948 годзе адбыўся першы выпуск бібліятэчных спецыялістаў. Паступова колькасць студэнтаў павялічваецца, развіваецца факультэт, удасканальваецца сістэма бібліятэчнай адукацыі.

Назавём асноўныя, найбольш адметныя, вехі развіцця факультэта:

– канец 50-х гг. – на факультэце навучаецца звыш 200 студэнтаў;

– 1950–1960 гг. – адкрыццё вячэрняга, завочнага аддзяленняў і экстэрнату;

– 1960 г. – стварэнне кафедры бібліяграфіі;

– 60-я гг. – пераход да падрыхтоўкі спецыялістаў па тыпах бібліятэк: «масавыя і навуковыя бібліятэкі», «дзіцячыя і школьныя бібліятэкі», «тэхнічныя бібліятэкі»;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– 1969–1970 гг. – адкрыццё на факультэце аддзялення культасветработы па спецыялізацыі «харавое дырыжыраванне»;

– 1975 г. – адкрыццё на базе факультэта бібліятэказнаўства і бібліяграфіі Мінскага інстытута культуры;

– 1983 г. – пераход на новы тыпавы вучэбны план і фарміраванне спецыялізацый па галіновых комплексах літаратуры;

– канец 80-х гг. – звыш 70 працэнтаў выкладчыкаў факультэта маюць вучоныя ступені і званні;

– 80-я гг. – толькі на дзённую форму навучання на факультэт штогод прымаецца каля 200 студэнтаў. На факультэце навучаецца каля 80 замежных студэнтаў;

– 1993 г. – змяненне назвы факультэта на «факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм». Пераход на пяцігадовы ўніверсітэцкі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў. Адкрыццё аспірантуры па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства»;

– 1994 г. – стварэнне кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства і ажыццяўленне набору на спецыяльнасць «музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры»;

– 1994–1995 гг. – распачата рэалізацыя праграмы шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на базе Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума імя А.С.Пушкіна і Мінскага лінгва-гуманітарнага комплексу «гімназія – каледж» № 24 з 3-х гадовым тэрмінам навучання ва ўніверсітэце. Адкрыццё бакалаўрыяту і магістратуры;

– 1998–1999 гг. – распрацоўка першага дзяржаўнага адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія»;

– 2000–2001 гг. – распрацоўка і зацвярджэнне ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам новага базавага вучэбнага плана па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» з пяцігадовым тэрмінам навучання;

– красавік 2003 г. – рэарганізацыя факультэта ў факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый з кафедрамі: гісторыі і тэорыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, інфармацыйных рэсурсаў, менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, гісторыі Беларусі і музеязнаўства, беларускай філалогіі і замежнай літаратуры, замежных моў;

– 2003 г. – ажыццяўленне спецнабору студэнтаў для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– 2008 г. – распрацоўка адукацыйнага стандарту другога пакалення па спецыяльнасці 23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) і адпаведных вучэбных планаў;

– 2012 г. – распрацоўка адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 80 01 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства (другая ступень – магістратура);

– 2014 г. – распрацоўка адукацыйнага стандарту трэцяга пакалення па спецыяльнасці 23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (напрамкі: аўтаматызацыя, інфарматызацыя, менеджмент, метадычнае забеспячэнне) і адпаведных вучэбных планаў. 77 працэнтаў выкладчыкаў факультэта маюць вучоныя ступені і званні.

Сёння вышэйшая бібліятэчная адукацыя на постсавецкай прасторы перажывае не лепшыя часы, дарэчы, як і ўся бібліятэчная справа. Адбываецца аптымізацыя сеткі бібліятэк, што прывяло да значнага скарачэння колькасці бібліятэк. З'явіліся, так званыя, гібрыдныя бібліятэкі – бібліятэка-клуб, бібліятэкамузей, адбываецца аб'яднанне дзіцячых і школьных бібліятэк.

Бібліятэкі актыўна шукаюць сваё месца ў сацыяльна-эканамічным жыцці краіны. Яны становяцца не толькі інфармацыйнымі, але і сацыякультурнымі, адукацыйнымі, камунікатыўнымі цэнтрамі, так званым «трэцім месцам» (сям'я, праца, бібліятэка). Усе гэтыя змены непасрэдна ўздзейнічаюць на падрыхтоўку бібліятэчных кадраў, на змест адукацыйных праграм, на запатрабаванасць у спецыялістах, арганізацыю набору студэнтаў, прафарыентацыйную работу.

У апошнія гады адной з самых значных праблем у адукацыі стала дэмаграфічная праблема. Гэта прывяло да неабходнасці значнага скарачэння набору студэнтаў па спецыяльнасці «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць».

У 2014 годзе набор склаў 90 чалавек (60 чалавек на дзённую форму навучання і 30 на завочную). Для параўнання – у 1972 годзе набор толькі на дзённую фому навучання складаў звыш 200 чалавек, а на факультэце бібліятэказнаўства і бібліяграфіі навучалася 1730 чалавек па вочнай і завочнай формах; у 2009 годзе набор складаў 120 чалавек па дзённай і 100 чалавек па завочнай форме навучання. Відавочна, што прычыны тут не толькі ў дэмаграфіі, але яшчэ больш у рэзкім змяншэнні прэстыжнасці бібліятэчнай прафесіі, вельмі нізкіх заробках бібліятэкараў, экспансіі інтэрнэту і іншых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такое становішча прымушае перагледзець усю сістэму набору студэнтаў і прафарыентацыйнай работы. На аснове вывучэння патрэб фарміруецца заказ на спецыялістаў з боку бібліятэк краіны, і такі заказ мы маем да 2020 году. Ён больш, чым у два разы, па гадах перавышае запатрабаванасць у спецыялістах у параўнанні з лічбамі набору студэнтаў на факультэт. Значную ролю ў фарміраванні заказу адыграла Пастанова Савета міністраў Рб 2011 года «Аб зацвярджэнні палажэння аб базавай арганізацыі ўстановы адукацыі». Факультэтам падпісана звыш 20 дамоў аб узаемадзеянні з найбуйнейшымі бібліятэкамі Беларусі. У гэтых дамовах вызначаюцца патрэбы і заказ на спецыялістаў канкрэтнай бібліятэкі. Гаворыцца таксама пра тое, што такія бібліятэкі маюць прыярытэт у атрыманні выпускнікоў.

Выкарыстоўваюцца ўсе формы і метады прафарыентацыйная работы: яна стала больш адраснай і накіравана на непасрэднае ўзаемадзеянне з выпускнікамі ў школах, бібліятэках, універсітэце. Пры правядзенні прафарыентацыйнай работы сярод работнікаў бібілілятэк, якія не маюць вышэйшай адукацыі, шырока выкарыстоўваюцца нарады дырэктараў бібліятэк, пісьмы-звароты ў мясцовыя органы ўлады. Папярэдне складаюцца спісы патэнцыйных абітурыентаў. Вялікую дапамогу ў правядзенні прафарыентацыйных мерапрыемстваў аказваюць бібліятэкі. Увогуле, прыйшоў той час, калі прафарыентацыйная работа павінна стаць адным з асноўных напрамкаў і дзейнасці саміх бібліятэк, а не толькі факультэта.

Таксама маюцца пэўныя цяжкасці і пры ажыццяўленні набору на другую ступень вышэйшай адукацыі – магістратуру. Часта бібліятэкі самі, на жаль, не зацікаўлены ў падрыхтоўцы магістрантаў. Адной з асноўных праблем з’яўляецца нявызначанасць сацыяльнага статусу выпускніка магістратуры, адсутнасць на дзяржаўным узроўні нарматыўна-прававых дакументаў, якія б вызначалі гэты статус, пераліку пасад для магістраў. Кіраўніцтва факультэта прапанавала Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь унесці змены ў кваліфікацыйны даведнік «Должности и квалификации в сфере культуры и искусств» у дачыненні пераліку прыярытэтных пасад, якія могуць займаць выпускнікі магістратуры ў бібліятэках, а таксама кваліфікацыйных патрабаванняў да іх.

У 2014 годзе адбылася яшчэ адна значная падзея ў жыцці факультэта: 20-годдзе з дня заснавання навукова-педагагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школы па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства», якая была афіцыйна зацверджана Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй (ВАК) Рэспублікі Беларусь. Утваральнікам і пастаянным кіраўніком школы з'яўляецца доктар педагагічных навук, прафесар, сапраўдны член грамадскай арганізацыі (ГА) «Міжнародная акадэмія інфарматызацыі пры ААН (г. Масква), член-карэспандэнт ГА «Беларуская акадэмія адукацыі», прафесар кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый – В. Е. Лявончыкаў.

Інтэлектуальную аснову навуковай школы складае прафесарска-выкладчыцкі склад спецыяльных кафедраў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, супрацоўнікі бібліятэк Беларусі, якія абаранялі свае дысертацыі ў спецыялізаваным навуковым савеце БДУКМ, а таксама прадстаўнікі іншых устаноў.

Праблематыка даследаванняў і распрацовак у навуковай школе ахоплівае пытанні гісторыі, тэорыі, метадалогіі, методыкі, тэхналогіі, арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, бібліяграфіі, кніжнай культуры. Паколькі навуковая школа створана ў галіне навукі педагогікі, важная ўвага ў даследаваннях таксама надаецца распрацоўцы педагагічных аспектаў, якія звязаны з выкарыстаннем кнігі, інфармацыі, інфармацыйных рэсурсаў у развіцці асобы, выхаванні і адукацыі. Падрабязна вобласці дысертацыйных даследаванняў выкладзены ў пашпарце навуковай спецыяльнасці 05.25.03 – бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства, які зацвярджаецца ВАК РБ, пастаянна пераглядаецца і актуалізуецца ў межах навуковай школы.

За час існавання навуковай школы была абаронена 1 доктарская (Р. С. Матульскі) і 18 кандыдацкіх дысертацый. Найбольшая колькасць кандыдацкіх дысертацый была абаронена пад кіраўніцтвам прафесараў В. Е. Лявончыкава (5 дысертацый) і Р. С. Матульскага (3), дацэнтаў Зыгмантовіч С. В., Н. У. Клімянковай, М. А. Яцэвіча (па дзве); У. А. Акуліча, Л. А. Дзямешкі, В. А. Касап, Н. А. Ляйко (па адной). Вучоную ступень кандытата педагагічных навук атрымалі таксама пяць грамадзян замежных краін (Іарданіі, Ірака, Камеруна, Сірыі).

Колькасна і якасна навукова-педагагічная школа складаецца з 4 дактароў і 30 кандыдатаў навук. Навуковую школу складаюць аспіранты і выпускнікі аспірантуры, якія маюць навуковыя публікацыі, але пакуль не абаранілі кандыдацкія дысертацыі, а таксама выпускнікі магістратуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па выніках даследаванняў «школы» толькі за апошнія 10 гадоў было апублікавана каля 600 навуковых і навукова-метадычных прац, сярод якіх: артыкулы, 11 манаграфій, 5 зборнікаў навуковых артыкулаў, 3 зборнікі матэрыялаў канферэнцый, прысвечаных юбілеям ФІДК, 25 вучэбных і 8 навукова-практычных дапаможнікаў, 3 адукацыйныя стандарты, вялікая колькасць тыпавых вучэбных праграм. Навуковыя працы друкаваліся ў ЗША, Казахстане, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, Украіне і іншых краінах.

Як бачна, навукова-педагагічная школа «бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» мае значныя дасягненні ў сваёй дзейнасці. Яна цалкам адпавядае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад'яўляюцца да такіх навуковых утварэнняў.

Аднак час не стаіць на месцы: у дзейнасці навуковай школы ўзнікаюць пэўныя праблемы. Адна з асноўных – неабходнасць падрыхтоўкі новага пакалення навукова-педагагічных кадраў. Асабліва гэта датычыцца дактароў навук. Функцыянаванне савета па абароне кандыдацкіх дысертацый у адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК магчыма, калі ў яго склад уваходзіць не менш за чатырох дактароў навук па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства». У Беларусі іх толькі тры, таму ў склад савета ўваходзіць доктар навук з Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры і мастацтваў. Неабходна таксама павялічыць колькасць абарон кандыдацкіх дысертацый. Калі сітуацыя не палепшыцца ў бліжэйшы час, то пад пагрозай будзе і дзейнасць вышэйназванага савета, а значыць, і нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі навуковых кадраў у галіне бібліятэказнаўства. Важным напрамкам удасканалення дзейнасці школы з'яўляецца таксама неабходнасць больш шчыльнага ўзаемадзеяння з іншымі ўстановамі (бібліятэкамі), якія праводзяць кнігазнаўчыя і бібліятэказнаўчыя даследаванні, хаця такая практыка і існуе.

Такім чынам, вышэйшая бібліятэчная адукацыя Беларусі мае ўласныя традыцыі і вялікія дасягненні. Яна прадстаўлена высокакваліфікаваным прафесарска-выкладчыцкім складам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый і найбуйнейшых бібліятэк Беларусі. Такім чынам, настала неабходнасць удасканальвання існуючай сістэмы бібліятэчнай адукацыі ў адпаведнасці з рэаліямі сёняшняга часу і патрабаваннямі Балонскага працэсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ